ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Цѣна асобнаго № усюды 25 кап.

ВАРУНКІ ПЕРАДПЛАТЫ:

На год	8 р. — к.
„ полугода	4 „ 50 „
„ 3 месяца	2 „ 15 „
„ 1 месяц	— „ 75 „
За границу на год	20 р. — „

Перамена адрысу 40 коп.

Адрэс рэдакцыі: Птрг., Знаменская, 36. Тэл. 253—43.

№ 3. Пятница, 5 марта. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. Пецярбург 1918 г. I-й год выданьня.

ДА ЧЫТАЧОУ.

С прычыны выезду Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту з Пецярбургу, радакцыя „Дзянніцы" так сама пакідае Пецярбург. Вось гэты нумар выходзіць перадапошнім, а мо і зусім апошнім у Пецярбурзі. Дачасна, пакуль газэта цвёрда асталюяцца—усякую караспадэнцыю, пісьмы, рукапісы і грошы на яе ім я просім перасылаць па адрысу вось якому: Москва, Московскій союзъ потребительных обществ, 2-й Переведеновскій пер., с. д., Ф. С. Станилевичу с передачею редакціи газеты „Дзянніца".

Радакцыя.

ОТЪ ЮРИДИЧЕСКАГО ОТДѢЛА БѢЛОРУССКАГО НАЦІОНАЛЬНАГО КОМИССАРІАТА.

При Юридическомъ Отдѣлѣ Бѣлорусскаго Національнаго Комиссаріата (Знаменская, 36, кв. 54) бѣлорусскому населенію даются справки по всѣмъ вопросамъ юридическаго характера. Консультація отъ 12 до 2 час. дня ежедневно, кромѣ дней неприсутственныхъ.

Юридическій Отдѣлъ Б. Н. К.

ЗМЕСТ ВАРУНКАУ ЗГОДЫ АБ ЗАМІРЭНЬНІ З ГЭРМАНІЯЙ.

Звесці з Брэсць-Літоуску, 3 марца. Згода аб замірэньні з Расеяй, напісаная сяго-дняшы паміж яе, Гэрманіяй, Аустра-Вэнгрыяй, Баугарыяй і Турцыяй.

1. Гэрманія, Аустра-Вэнгрыя, Баугарыя і Турцыя, з аднаго боку, Расея з другога звешчаюць, што вайна між імі кончылася; яны хочуць жыць далі у спакою і згодзе.

2. Кожная з згоджваючыхся старон павінна кінуць усякую агітацыю або прапагянду супроціу гасударственнага і военнага парадку другое страны. Гэтая павіннасць, паколькі яна належыць да Расеі, мае моц і у тых землях, што заняты дзяржавамі чацьвярнога хаурусу.

3. Землі што ляжаць на захад ад устаноуленае згоджваючыміся мяжы і належалі колісь да Расеі, не будуць далі астацца пад яе вярхоуным уладарствам. На гэтай згодзе, разам абедзвімі старанамі установленая мяжа ёсць важнейшая частка прыложанаго пляну. (Замета 1: гэтая мяжа будзя выраблена расейска-нямецкай камісіяй). Калішняя належа гэтых зямель да Расеі не накладае цяпер на іх ніякіх павіннасьцяу ўзглядам Расеі. Расея адказваецца ад усякага умяшацельства у іхнія дзелы. Гэрманія і Аустра-Вэнгрыя мусяць парашыць будучую долю гэтых зямель па згодзе з іх жыхарамі.

4. Як толькі будзе зроблена замірэньне паміж усіх ваюючых гасударствау і расейскія вайска будуць сусім распушчаны, Гэрманія гатова пакінуць тыя землі, што ляжаць на усход ад мяжы, аб якой гаворыцца у першым пункце трецяй стацьці, калі гэта ня зачэпляе стацьці шостай. Расея зробіць усё, што трэба, каб хутчэй ачысьціць і вярнуць Турцыі па закону Анатолійскія губэрні на ўсходзе. Акругі Ардагану, Карс і Батум павінны быць гэтак-жа хутка аслабаняны ад расейскіх вайскоу. Расея не будзе мяшацца у государственныя міжнародно-правовыя справы гэтых зямель і пазволіць тутэйшаму народу зрабіць новы парадак і установы па узгодзе з суседнімі гасударствамі, паміж іншым з Турцыяй.

5. Расея павінна барджэй распускаць свае вайска, ваваттыя часці, што былі нядауна забраны цяперашнім правіцельствам. Свае ваенныя карабкі яна адвязе у расейскія гавані, дзе яны астануцца да замірэньня усіх народау, або хутка разаружыць іх. На конт ваенных караблёу тых гасударствау, якія яшчэ вядуць войну з дзяржавамі чацьвярнога хаурусу, то з імі трэба гэтак зрабіць, як і з расейскімі. Частка Паунсчнаго мора, якім усе народы маюць права карыстацца, астаецца такою да замірэньня усіх. Балтыцкае мора, як і Чорнае, дакуль валадзее імі Расея, павінны быць аслабаняны ад мінау. Слабоднае гандлёвае плаваньне на гэтых марах павінна быць барджэй пачата ізноу. Дзеля працы над боляй рыхтыковымі пастановамі, апрыч усяго на конт гандлёвае язды па морам бяз страху, будуць зробляны змяшаныя камісіі з абедзвіх старон. Мары павінны быць сусім аслабаняны ад плаваючых мінау.

6 Расея павінна хутчэй замірыцца з Украінскай народнай рэспублікай і даць сваю згоду на замірэньне паміж яе і дзяржавамі чацьвярнога хаурусу. З зямель Украіны выводзяцца хутка расейскія вайска і чырвоная гвардыя; Расея пакідае вясці усякую агітацыю супроціу правіцельства і грамадзянскіх установау Украіны. З Эстляндзі і Ліфляндзі гэтак-жа мусяць быць хутка вывядзены расейскія вайска і чырвоная гвардыя. Агульна усходная краіна Ліфляндзіі па Чуцкаму і Псковскаму вазёрам да палудзённа-заходнаго рогу апошняго, далай пераз Лубанскае возяра рыхтам к Лівянгофу на Дзвіне. У Ліфляндзі і Эстляндзі нарыхтоуваюцца нямецкія паліцэйскія уласці, дакуль ня установіцца там спакой дзеля народу, гасударцтвенная хворма управы і парадку. Расея хутка аслабаняе усіх арыштованых і сілком вывязеных жыхароу Эстляндзіі і дарус ім взмогу бяз датыркаваньня вярнуцца.

7. Фінляндзія і Аландскіе астравы павінны быць пакінуты расейскімі вайскамі і чырвонаю гвардыяй, а фінскія гавані—рускімі караблямі. Пакуль мора замёрзшы і нема взмогі вывязці расейскія караблі, на іх павінны быць пакінуты толькі невялікія каманды. Расея кідае усякую агітацыю супроціу правіцельства і грамадзянскіх установау Фінляндзі. Ваенныя мацаваньня на Аландскіх астравох мусяць быць як можна хутчэй пакінуты без нічога. На конт забароны умацоуваць гэтые астравы і іх хутчэйшаго пярарабляньня дзеля ваеннае справы, а разам з гэтым і пытаньня паводлух таго, як належыць ездзіць па марах, павінна адбыцца асаблівая згода паміж Гэрманіяй, Расіяй, Фінляндзіяй і Швэцыяй. Патрэбна, каб к абмяркаваньню гэтых рахункау былі, па волі Гэрманіі, прыцягнуты прэдстаунікі і другіх калябалтыцкіх гасударствау.

8. Абедзві стараны павінны вярнуць пленныхъ на іх родны край. Гэтае дзела будзя зроблена даскакальна паслана закладзіна асаблівых згод, якія будуць відаць з трэцьцяй стацьці.

9. Кажная ад згаджаюшчыхся старон атказваяцца ад платы другой старане за патраты дзеля вайны, значыцца такіх, якія былі зробляны гасударствамі на самую вайну і такім-жа парадкам ад платы за убыткі ад вайны, якія пацярпела гасударства ці яго падданыя у тыхъ мейсцах, дзе была вайна, далучая і усе раквізыцыі на зямлі ворага.

10. Дыпламатычныя і консульскія звязкі паміж згоджаваюшчыхся старон настаюць зразу пашы замацаваньня згоды замірэньні; на конт пытаньня аб кансультацыях абедзві стараны выробляюць асаблівыя згоды. Дзеля звязак на гасударствяннай гаспадарцы належыць трымацца вось якіх пастановау: стацьця другая дзеля нямецка-расейскіх зносін, стацьця трэйцяя дзеля аустра-вэнгэрска-расейскіх, стацьця чацьвертая дзеля баугарска-расейскіх, стацьця пятая дзеля турэцка-расейскіх. Да стацьці сёмай належыць дадаць, што Пэрсія і Ауганістан ёсць самавітыя гасударствы, прымаюць павіннасць заступацца за іх палітычную гаспадарскую і зямельную самавітасць.

11. Перабудоуля грамадзянскіх і кажнаго асобнаго чалавека праваных датырканяу, абмен пленнымі і забратымі у плен, пытаньне аб пераробя правоу тых, хто іх няма цяраз вайну, і пытаньне аб гандлёвых караблёх, пераймапых у часы вайны, маюць найважнейшую частку з гэтае згоды і будуць абрахованы асаблівымі згодамі і вайдуць у моц, як можна толькі, разам з гэтаго згодаю.

12. Дзеля зносау паміж Гэрманіяй і Расеяй мусіць быць нямецкае і расейскае пісьмо; дзеля зносау паміж Аустра-Вэнгрыяй і Расеяй-нямецкае, вэнгэрскае і расейскае; дзеля зносау паміж Турцыяй,—Расеяй-турэцкае і расейскае.

13. Ратыфікаціённыя паперы, якімі замацоуваяцца замірэньня павінны перадаць адна другой згоджваюшчыяся стараны у Бэрліні, як можна хутчэй. Расейскае правіцяльства павінуецца зрабіць абмен закладнымі ратыфікаціённымі дакумэнтамі, калі захочэ гэтаго адна з дзяржау чацьвярнога хаурусу у два тыдні. Згода аб замірэньні прыймае моц зразу пасля жа ратыфікацыі, як яна нічога ня мае супроціу ня кожнага пункту заметау і дадаўняючых варункау.

ДЭКЛЯРАЦЫЯ (АПАВЕШЧЭНЬЕ) РАСЕЙСКАГО ДЭЛЕГАЦЫІ НА КОНТ ЗАМІРЭНЬЯ.

Перад падпісаньнем у Брэсці згоды аб замірэньні, у час збору 3 марца, расейская дэлегацыя дзеля замірэньне зрабіла вось якое апавешчэньне.

Работнічае Селянскае Правіцяльства Расейскай Рэспублікі нападкам нямецкіх вайскоу на Расею, каторая звешчала аб канцы вайны і адпусціла свае арміі, прынуджанае атрымаць нямецкі ультыматум, звесціла аб гэтым 24 лютага і паслала нас падпісаць гэтые варункі, гвалтоуна нам начэпляныя.

Перамовы, якія веліся дасюль у Брэсць-Літоуску паміж Расеяй, з аднаго боку, Гэрманіяй і яе хаурусьнікамі з другога, давольне цапэуна і ясна дзеля усіх паказалі, што, як яго завуць нямецкіе прэдстаунікі «Замірэньне згоды» усамдзелечы ёсць замірэньне рыхткам захапляньне і вярхоунага уладарства. Цяпера брэсцкія варункі шмат яшчэ горшыя. Замірэньне, якое цяпер робіцца тут у Брэсць-Літоуску ня ёсць замірэньне на закладзіне слабоднае згоды паміж народау Расеі, Германіі, Аустра-Вэнгрыі, Баугарыі і Турцыі. Гэта замірэньня, якое прачытана з аружжам у руках. Гэта замірэньне, якое шчапіушы зубы, павінна атрымаць рэвалюцыйная Расея. Гэта замірэньня, якое пад мэтай «аслабаненьня» расейскіх ускраін, усамдзелечы перарабляе іх у нямецкія губэрні і адымае у іх права на слабодную самавітую камправу, якое адказала ім работнічае і селянскае правіцяльства рэвалюцыйнае Расеі. Гэта ёсць замірэньне, якое пад мэтай узбудовы парадку у гэтых землях з аружжам памога уціскацялям супроціу працоунікоу ізноу узваліць на гэтых апошніх ярмо уціску, скінутае расейскай рэвалюцыяй. Гэта ёсць замірэньня, што вертае зямлю паном і ізноу гоніць працоунікау у закрапашчэньне к гаспадаром хвабрікау і заводау.

Гэта замірэньне, што на доугія часы начэпляе працоуніком народу Расеі яшчэ у горшым абліччы калішнюю гандлёвую згоду, зробленую у 1904 леця дзеля карысці нямецкіх валадароу зямлі і у той-жа самы час забязпячае нямецкаму і айстра-вэнгэрскаму імучаму саслові заплату працэнтау па даугом царскаго правіцяльства, ад якіх адцуралася рэвалюцыйная Расея. Напасля, якбы дзеля большага абрысу сусім суслоунаго абліччя нямецкага ваеннаго наступу, нямецкі ультіматум маніцца заткнуць рот расейскай рэвалюцыі, забараняючы агітацыю супроціу правіцяльствоу дзяржау чацьвярнога хаурусу і іх ваенныхъ уласьцёу.

Але гэтага мала. Усё пад той-жа мэтай зрабіць парадак, Гэрманія моцай аружжа займае землі, дзе жывуць сусім расейскія жыхары, і установляе там устрой ваеннага займаньня і павароту к парадкам, што былі да рэвалюцыі. На Украіне і у Фінляндзі Гэрманія патрэбуе, каб рэвалюцыйная Расея ня умешвалася, а у той-жа самы час вельмі жыва маніцца пайсці на падмогу контръ-рэвалюцыйным сілам супроціу рэвалюцыйных працоунікау і селян. На Каукязі, на пэунае зрушэньне варункау афармляных самым-жа нямецкім правіцяльствам у ульціматумі 21 лютага, Гэрманія адымае дзеля Турцыі ні разу ня быушыя забранымі у час вайны турэцкімі вайскамі землі Ардагану, Карсу і Батуму, ніколькі ня прыймая да рахунку, чаго усамдзелячы хочуць жыхары гэтых зямлёу. Самыя адкрытыя і гвалтоуныя захапляньня земляу, завалодзеньне важнейшымі мейсцамі, якіе маюць выгаду дзеля вайны, мусяць мець толькі адну мэту: прыгатаваць другі наступ на Расею і абараніць замыслы грабіцельскіх супроціу работнічай і селянскай рэвалюцыі—всеъ якія сал[illegible] мэта, якім мае служыць наступ нямецкіх вайскоу, пачаты 18 лютага бяз прадсказаньня за 7 дзён, аб чым быу варунак у згодзе аб зацішэньні, зробленым паміж Расеяй і

таріями и предположеніями. Необходимо такимъ «комиссіямъ» дать самую широкую иниціативу дѣятельности, дабы въ ихъ лицѣ создать тѣ ячейки, вокругъ которыхъ могли бы сплотиться всѣ, уже существующія, организаціи подобнаго рода.

Но, необходимо, вмѣстѣ съ тѣмъ, помнить, что такія учрежденія мѣстнаго, но весьма важнаго характера должны какъ можно ближе стоять къ нуждамъ трудящихся массъ, чтобы тѣмъ самымъ знать всѣ ихъ сокровенныя думы и желанія.

Работы «Совѣщанія» могутъ впослѣдствіи послужить тѣмъ матеріаломъ, какой необходимъ будетъ въ качествѣ пособія и канвы для будущаго краевого строительства, будущему Всебѣлорусскому Съѣзду.

Такова, такъ сказать, научная сторона работъ юридическаго отдѣла. Надо помнить, что отдѣлу еще предстоитъ впереди и широкая культурно-просвѣтительная работа юридическаго характера: надо будетъ насаждать среди населенія забитаго и духовно и физически края идеи новаго Совѣтскаго строительства.

О ближайшихъ практическихъ шагахъ поговоримъ въ слѣдующемъ номерѣ. Пока же пожелаемъ начинающимъ продуктивности ихъ работы. Богъ помощь!

Н. С.

Смутные дни. Городъ наполненъ самыми противорѣчивыми слухами. На улицахъ людно. Изъ устъ въ уста передаютъ «самыя новыя и самыя точныя свѣдѣнія» о ближайшихъ намѣреніяхъ нѣмецкихъ ударниковъ. Всѣ точно сговорившись пугать другъ друга катастрофическими предположеніями. Слышишь все, о чемъ стонутъ, что нашептываютъ на ухо другъ другу потерявшие голову обыватели—и съ ужасомъ видишь, какъ непрочна поддержка массъ въ трудную минуту.

Революціонный народъ въ лицѣ лучшихъ своихъ представителей напрягаетъ всѣ усилія, проявляетъ примѣры необычайной энергіи, совершаетъ героическіе подвиги въ борьбѣ съ ощетинившимся звѣремъ контръ-революціи. Но, несмотря на это, во всемъ чувствуется недостатокъ знанія, опыта, организаціи.

Печальное наслѣдіе царизма—полное разстройство государственнаго аппарата, усилившееся еще благодаря тому, что правительства до-октябрскаго переворота, желая совмѣстить несовмѣстимое, старались новыя соціалистическія идеи заключить въ узкія и гнилыя бюрократическія формы, вливая новое вино въ старые мѣхи,—требуютъ героическихъ усилій и долгаго, упорнаго созидательнаго труда, чтобы изъ создавшагося хаоса начали выявляться новыя, лучшія, идеальныя формы общественнаго правопорядка, о которыхъ могли только мечтать старые борцы за революцію.

И въ этотъ творческій періодъ революціонный пролетаріатъ оказался предоставленнымъ самому себѣ.

Тѣ, которые по своимъ дарованіямъ и знаніямъ должны были играть роль вождей революціи, точно вспугнутая стая птицъ, приводившихъ до того своими пѣснями въ восторгъ и умиленіе слушателей, приближая ихъ къ небу,—оказались не въ состояніи практически осуществить то, о чемъ они такъ увлекательно говорили.

Слово разошлось съ дѣломъ.

Отдѣльныя отрицательныя явленія, неизбѣжный элементъ борьбы, показались ихъ женственнымъ натурамъ слишкомъ ужасными, и они, прикрывшись тогой принципіальнаго расхожденія въ тактикѣ съ руководящими партіями, молчаливо согласились отдалить время соціальнаго устройства жизни на не опредѣленный срокъ, и отказались принимать участіе въ строительствѣ.

Теперь мы живемъ въ моментъ перелома. Ужасы нависнувшіе со всѣхъ сторонъ неудачи. Мы ждемъ чуда.

Единственная надежда наша на возстаніе пролетаріата всего міра, среди котораго уже замѣчаются признаки революціоннаго броженія.

Въ нашихъ интересахъ содѣйствовать революціонной вспышкѣ на Западѣ, для чего мы должны, закрѣпляя завоеванія революціи у себя, собирать силы и облегчать возможность возстанія среди нашихъ зарубежныхъ братьевъ.

Нужна работа, работа и работа.

Не покладая рукъ.

День и ночь.

Не останавливаясь ни передъ какими лишеніями и препятствіями съ вѣрой въ близкую всемірную революцію.

Въ этотъ трагическій моментъ обращаюсь я къ Вамъ братья—Бѣлоруссы—трудовая интеллигенція—съ горячимъ призывомъ сбросить съ себя личину обиженной невинности, и приняться за работу, чтобы поколѣніе ваше не бросило вамъ упрека за то, что и вы своими руками помогали задушить великую россійскую революцію.

Всѣ за работу во имя близкаго свѣтлаго будущаго!

Але—Гри.

Сіся-тоя з-за граніцы.

З ГЭРМАНІ. Нямецкі друк ня перастае абрадж аць варункі замірэньня з Расеяй. Буржуйныя і грашауніцкія газэты захлебваюцца ад думкі, што пакора Расеі прынясла гэрманскім багачам вялікія выгады. Гэтак, адна з газэт піша, «што, дзякуючы сіле нямецкуй арміі, якая дала атпор расейцам, у Расеі прапау плян пакарыць сабе усю Яуропу. Апроч гэтага, зруйнованы сілы царызму і панславізму (злучэньня усіх славян). Палітыка заваёвы Яуропы збіта. Газэта рада, што нямецкая царства з Расеяй боляй граніцау мець ня будзя. «Граніц гэтых зусім німа,—дабауляя другая газэта. Павішнасць Расеі няумешвацца агітацыяй у справы нямецкаго царства—робіць спакой на Усходзі»,

Другія газэты радуюцца і за Турцыю, што ёй атабралі ад Расеі тры акругі. Вядома-сьвята у нямецкай буржуазеі вялікая. Вярхоупік яе, сам Вільгельма, тэлеграмаю вітая палашоу гэнэралау Гіндэнбурга і Люндорфа, за тоя, што яны пошля чатырохгадовай вайны дабіліся ля Гэрмані пачэснаго замірэньня. «Нашы балтыцкія браты (памешчыкі, бач)—канчая ён тэлеграму, аслабоджаны ад расейскаго прыгону і магуць цяпер азываць сябе немцамі. І далей Бог награда нам.» У свой чарод Вільгельма вінтуя старшыни парламенту нямецкаго, [illegible]. А пад гэты ж [illegible] настрой, шырока [illegible] у мэтах агітацыі сярод народу, [illegible] дальшую праграму [illegible] народау і краеу. Гэтак, спадобны як з Расеяй, Гэрманя прымусіла Румыню надпісаць гвалтоуны і здзекліны мір. А на задушэньня работнічаго паустаньня у Фінляндзі паслала войска. На растраты вайны зробляна новая пазычка грошы, у ліку 12 мілярдау. Адным словам, сіла буржуазеі, паноу і грашаунікоу у Гэрмані дужа мосная пакулыпто і з гэтаго боку яны стараюцца стаць палашамі дэмократыі усяго сьвету. І ім ня пярашкаджаюць гэтаго рабіць сацыялісты — згодчыкі, прыхільнікі Шэйдамана, якія ніяк ня пратэстуюць супроць пасылкі войска у Фінлядзію.

Толька незалежныя сацыялісты, за якімі с кожным днём становіцца боляй рабочых пяпакідаюць вясці бараньбы з усімі палашамі свае старонкі. У парламэнці, адзе обраджваліся варункі замірэньня з Расеяй, незалежны с.-д. т. Гаазе празвау гэты варункі гвалтоуными, нячуванымі, пошля чаго смехам здаюцца словы, быццам Гэрманя хоча замірэньня і згоды. «Самабудова народау топчацца пагамі,—казау ён:—і абецанкі робяцца цацанкамі. Хлусьба, быццам руская дэлягацыя адмовілася вясці перагаворы, яна толькі адказалася падпісаць замірэньня, як гвалтоуая. Пазорна, кажа далей прамоуца, што напад на безваружны народ святкова. Сьвядомыя нямецкія салдаты адмауляюцца быть палашамі расейскай раваляцыі. Мы ня маем ні трошкі правоу замешвацца у нутраныя справы Расеі і Фінляндзі. Наша партыя,—даводзіць Гаазе самым цвердым [illegible] пратэстуя супроць палітыкі нагнёту і гвалтоуя. Нямецкія рабочыя страшна [illegible], што ім прыходзіцца каваць ланцугі ля расейскіх братоу». Другі незалежны сац.-дэм. Фэгтэррурэйстазі сказау: «Ультыматум (патрабаваньня адказаць на запытаньне, або не), заяуляньне Расеі, становіць сабе задачу гвалтоуную гэрманізацыю (зва-рот на гэрманства) абшар, якія дагэтуль належалі да Расеі; гэта завецца вынауненьням даць народам правы на самабудову! Што датыча украінскаго хлебнаго замірэньня, дык Гэрманія і Аустра-Вэнгрыя ужэ сварацца за здабытак. Большасць сацыяль-дэмакрацкай партыі абмануя рабочых, кажучы, быццам мы абараняямся. Усе нашы жаданьня павінны быць павернуты на тоя, каб зрабіць замірэньня з Расеяю. Бэльгія мусіць быць забяспечана ад знарушэньня нэйтралітэту (няумешнасці), які установлян ля яе дагаворам 1838 г. У Польшчы граніца павінна пайсці праз Нароу да Чанстахова. У нас, у Гэрмані, кіруя ваенны стан, і за гэта павіпян ня хто іншы, як тыя сацыялісты, якія прыслухоуваюцца да правіцяльству і разам з ім робяць праступную ваенную палітыку».

У Аустры: Ня адстае ад свае сястры гэрманскае буржуазеі, і аустрыяцкая. У сваіх газэтах яна так сама радуяцца таму замірэньню, на якоя вымушана была пайсці Расея. Між іншым усяго ляпей ля аустрыяцкае буржуазеі тоя, што Расею заставілі ня вясці у нямецкіх і аустрыяцкіх землях рэвалюцыйнай камуністычай прапаганды (падбухторваньня). Ня гэтак, вядома, думая аустрыяцкі працоуны народ, які моцнаю забастоукаю прымусіу правіцельства ня ушчываць пошля Брэсцьскаго згавору вайны з Расеяі які, трэба верыць, няузабаві загавора языком расейскіх братоу сваіх і таварышау.

З Англі: Англіцкая капіталістычная правіцяльства, якое да гэтых пор лічылася хаурусьнікам Расеі, вядзе ня лепшую палітыку, ніш нямецкая буржуазея. Гаворучы весь час пустыя словы аб згодзі з Расеяю, яно пад канец выявіла сябе і шчыра пачало хаурусавацца з Японскаю, Французскаю і Амерыканскаю буржуазеяй, каб напасці з другога боку на Расейскую Распубліку. Ня салодкім пахня ім ад працоунаго люду Англі, дык трэба ж пажар тушыць усім разам. Тым часам весткі аб пашырэньні раваляцыйнаго руху у Ірландзі становяцца усе праудзівейшымі і грознейшымі. Яна уся аб'яулена на асадным палажэньню. С часу на час чакаць можна паустаньня.

У Амэрыцы сацыялісты настроены за вайну з Гэрманіяй. [illegible] дэмакраты ад зруйнуваньня іх Гэрманіяй. У разалюцыі, наміж іншым гаворыцца. «Сацыялісты азнаюць свой абавязак у стасунках да сваіх братоу у Расеі. Мы павінны стаць у перадзі Крыжоунага паходу супроць крузвага сабакі Яуропы. Кіруючы сходам Вільям Эдалін, старшыня жыдоускай сацыялістычнай лігі (злука) у Амэрыцы, сказау: «У мяне німа слоу, каб выказаць усю злосць, якую падпімаюць усе тыя зверствы, што чыняцца у Расеі гэрманскімі гуртамі, якіх гоніць у перад нямецкая юнкерства».

Амерыканскія таварышы дужа спагадаюць расейскім рабочым і бачаць у паборы немцамі Расейскае дэмакратычнае распублікі пагрозу усім заваёвам працоунаго люду.

Кіраунічыя прэдстаунікі сацыялістычных партыяу звярнуліся да Мориса Гілквіда, які быу намечан сацыялістамі кандыдатам у гарацкого галаву г. Нюёрка у часы апошніх выбарау—с прапазыцыяй заложыць Чырвоную Армію супроць Гэрмані. Гілквід адказау ім: «Праявіці у жыццё гэта робіцца сумевным, але настрой, з-заякого узнік гэны план, падзяляецца цяпер многімі сацыялістамі і радзікаламі. Становіцца відаць, што інтарэсы сацыяльнаго поступу патрабуюць падтрымаць расейскі народ.

Як перадаюць газэты, Амерыканскі прэзыдэнт ня згоджваяцца, каб Японія захапіла Уладзі васток і другія мейсцы усходняй Сыбіры. Ен так сама у патрабаваньні замірэньня будзя стаяць на тым, каб Гэрманія вярнула забраныя у Расеі мейсцы.

Японія тым часам вядзе сваю справу спрома. Яна дабілася згоды і згаварылася з Англіяй і Францыяй, каб атхапіць у Расеі Сыбірскую чугунку у мейсцы Усходняй Сыбіру. З гэтай мэтаю туды будзя прыслапы атрад салдатау, зложаны з французау, англічан і японцау, лікам да 50.000 тысячау. Ля гэтаго Японія і Кітай робяць мабілізацыю свайго войску. Карыстая буржуазея і імпералісты цяжкімі варункамі Расейскай Распублікі.

— У Англіі пасягалі на жыццё Лойд Джорджа: у яго выстралілі у Ротэрдамі, але пуля праляцела поміж. Таго, хто страляу, ірланца, сцапалі.

— У Нарвэгі весь час ідуць дэманстрацыі рабочых, якія пратэстуюць супроць вайсковых настрояу буржуазеі.

У Фінлянд і далей цягняцца бойка між чырвонай і белай гвардыяй. Пакуль што усюдах перэмагая чырвоная гвардыя. Самым глауным месцам бояк павінна стаць паудзённая Фінлян дзя, а дзе збіраюцца вялікія сілы белай гвардыі, якая хоча адрэзаць Гэльсінфорс. Ідуць весткі, што селяня адказваюцца запісвацца у белую гвардыю, а у той самы час усе рабочыя запісваюцца у чырвоную гвардыю. Паміж Расейскай Фэдэратыунай Сацыялістычнай Распублікай і Фінляндскай Распублікай падпісан згавор згоды, які дужа радуя фінлянскіх рабочых. Па гэтаму згавору між іншым Расея атдае Фінляндзіі мейсцы на беразі Лёдаваго акіяну з гаванью, дзе можна увесь год лавіць рыбу, а так сама усе караблі фінлянскія маюць права увайходзіць у вауса расейскія гавані.

З другога боку старое фінскае буржуйная правіцяльства хаурусуяцца з немцамі, у якіх просіць падмогі ля сябе. Яны так сама зрабілі між сабою згавор гап . ёупы. Гэты згавор дае многа выгад немцам, за тоя яны узялі абавязак памагчы скінуць чырвоную гвардыю. Уж на Аланскіх астравох высадзілася нямецкая войска, якоя заглядая і у Фінляндыю. З-за гэтае прычыны чырвоная гвардыя паспешна капая равы, каб збараніць Гельсінфорс ад немцау.

Вайна на Беларусі.

С таго часу, калі было падпісана замірэньня, нямецкія войскі пачалі спыняцца у наступя. Дайшоушы зусім блізка да Воршы у Магілёушчыня і далека за Полацак у Вітэбшчыня, яны, па прыказу начальства, сталі вяртацца назад. З пад Воршы яны адходзяць [illegible] у Мінск. [illegible]

Вайна яны спыніла [illegible] Беларусі. Хадзячыя чуткі, быццам немцы рухаюцца да Смаленшчыны—ня праудзівы. Толькі ля Гомяля яшчэ кіпіць бойка, дзе немцы ідуць на поудзань, на Украіну.

Наша войска там дае ім моцны адпор, але з-за таго, што немцау дужа многа, яно вымушана адыходзіць...

Але калі заціхла вайна з немцамі, начынаюць та сям, та там падпімаць голау усякія ворагі раваляцыі: гэтак, каля Бабруску Беларуская Рада паслала свае войска на савецкая, а у Смаленшчыня открыт цэлы загавор буржуазеі супроць Радавай уласці. Стараюцца карыстаць палажэньням!..

Са Смаленску паведамляюць, што надоячы вярнулася дэлягацыя, якой было даручана правясці спрэчную межу між забранымі немцамі мейсцамі і застаючымі за намі ля Воршы. Прыпята згода на гэткіх варунках: замірэньня робіцца з абедзьвіх старон с таго моманту, калі пярэднія нямецкія гурты салдат праведаюць аб подпісу у Брэсці замірэньня, бач з 4 марца 1918 г. а 8 гад. раніцы. З-за гэтаго межа гэта часовая і будзя перайходзіць па Днярпу ад Вялікаго Замосця да Пустынкі, крыху на усход ад чугункі, у тым мейсцу, адзе яна датыкая дарогі Кохапаво-Верша, да паунеч на-усходняго вуглу у Храброукі проста па чугунцы да цэркві у Машкова. Мейсца на заход ад гэтае мяжы — лічыцца забранай немцамі. Станцыя Вόрша—таварная за немцам, а пасажырская за намі. Згавор мае сілу с часу яго падпісаньня.

Вόрша мала пакарпела ад гармат і людзяу. Тэлеграф ле звязан са Смаленскам і Вітэбскам. Магілёу знаходзіцца у нашых руках. Селяне гавораць, што немцы падсылаюць к межы шмат войску, каб у тым прыпадку, калі замірэньня ня падмацуюць, можна было нэбезпечня іці далей вайною.

Рэдактар **Д. ЖЫЛУНОВІЧ.**

Выдавец: **Беларускі Нацыянальны Камісарыят.**

Типографія «РАБОЧЕЕ ДѢЛО», Петроградъ, Ивановская ул., 14.